УДК 821.161.3:82-3

**Я. В. Шчэрба**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВОБРАЗ СТАРШЫНЫ Ў «ЛЕЙТЭНАНЦКАЙ ПРОЗЕ» ВАСІЛЯ БЫКАВА І БАРЫСА ВАСІЛЬЕВА

**Уводзіны.** Пачатак Айчыннай вайны — складаная і цяжкая тэма. Як захаваць карціну таго трагічнага часу, не абыходзячы тое хворае і горкае, што нараджаецца ў думках, калі гавораць пра вайну? Васіль Быкаў пісаў пра вайну, якой яна была — у пакутах і крыві. Мы даведваемся пра вайну па кнігах, фільмах, фотаздымках, успамінах тых, каму пашчасліліла дажыць да перамогі. Аб ёй пісалі ўдзельнікі і відавочцы тых трагічных падзей. Сёння тэма вайны працягвае хваляваць пісьменнікаў, якія адкрываюць у ёй новыя праблемы і аспекты.

**Асноўная частка.** Звернемся да прозы пісьменнікаў-франтавікоў Васіля Быкава і Барыса Васільева.

Дакладнага вызначэння, што такое «лейтэнанцкая проза», ў літаратуры няма. Многія даследчыкі пішуць пра традыцыі «ваеннай», або «лейтэнанцкай», прозы, але ў гэтых працах няма вызначэння «лейтэнанцкай прозы». Пад «лейтэнанцкай прозай» разумеюць творы пісьменнікаў савецкага перыяду, якія прайшлі Вялікую Айчынную вайну ў званні малодшых афіцэраў (пры некаторых нюансах, абумоўленых асаблівасцямі франтавога лёсу таго ці іншага пісьменніка) [1, с. 1].

Аўтары «лейтэнанцкай прозы» паказваюць канкрэтны час і прастору, дзе праходзіла Вялікая Айчынная вайна, знаёмяць чытача з пэўным колам асоб — герояў-франтавікоў. Прадстаўнікамі «лейтэнанцкай прозы» з'яўляюцца Канстанцін Вараб'ёў, Вячаслаў Кандрацьеў, Віктар Курачкін, Рыгор Бакланаў, Васіль Быкаў, Барыс Васільеў і інш. [1, с. 1]. Аўтары «лейтэнанцкай прозы» часцей за ўсё выкарыстоўвалі жанр аповесці, напісанай ад першай асобы [2]. Яна «прасякнутая крывёй, ахопленая агнём». Пісьменнікі-франтавікі сцвярджаюць, што зыход вайны вырашае герой і ім можа стаць кожны, нават малады неспрактыкаваны салдат або галоўнакамандуючы.

Адным з найбольш значных прадстаўнікоў «лейтэнанцкай прозы» з'яўляецца народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў — франтавік, які зведаў усе жахі вайны. «Пасля вучылішча, якое Васіль Быкаў закончыў у кастрычніку 1943 года, атрымаўшы званне малодшага лейтэнанта, ваяваў і на Украіне, і ў Румыніі, і ў Аўстрыіі — да самай перамогі» [3, с. 24]. У плане праўдзівага адлюстравання вайны ў Васіля Быкава ёсць шмат твораў, адзін з іх — «Жураўліны крык».

Сюжэтную аснову аповесці складае гісторыя пра тое, як шасцёра чырвонаармейцаў восенню 1941 года дзесьці пад Смаленскам на працягу няпоўных сутак абаранялі «звычайны чыгуначны пераезд, якіх нямала параскідана на сталёвых шляхах зямлі» [5, с. 9]. Гэта, аднак, своеасаблівыя суткі: на працягу іх загінуць усе героі твора [3, с. 40]. Старшына ўзвода — Рыгор Карпенка, нарадзіўся ў сялянскай сям'і, быў малодшым сынам. Пасля дзесяцігадовай службы ў войску трапіў на фінскую вайну, дзе атрымаў медаль. Пасля звальнення ў запас Карпенка быў прызначаны намеснікам дырэктара льнозавода. У аповесці Васіля Быкава старшына Рыгор Карпенка паўстае як строгі службіст, які прыдзіраецца да падначаленых. Гаворку з салдатамі ён вядзе грубым голасам, але, бывае, гаворыць насцярожана і ваўкавата: «Ну, каму тут? Вам, Фішар? Хаця ж у вас лапаткі няма. Во мне яшчэ ваякі! — злосна бурчаў старшына, устаючы з калена. Колькі дзён на фронце, а лапаткі яшчэ не прыдбаў. Што, мо чакаеце, калі старшына дасць? Ці мо немец у падарунак прышле?» [5, с. 11].

Адметным творам, напісаным у традыцыях «лейтэнанцкай прозы», з'яўляецца аповесць Барыса Васільева «А зори здесь тихие...», у якой значную ролю адыгрывае вобраз старшыны Васкова Фядота Яўграфыча. Яму трыццаць два гады, але адчувае ён сябе больш сталым, таму што стаў карміцелем сям'і ў чатырнаццацігадовым узросце. Добрай адукацыі Фядот Яўграфыч не атрымаў, але ведаў статут салдата. Усё жыццё Васкова праходзіла менавіта па гэтым статуту, які ён свята шануе, па ім вучыць сваіх салдат: «...Васкову бы не донесла. Занудит, запилит — света невзвидишь. Пример был: двух подружек из второго отделения старшина за рекой поймал. Четыре часа — с обеда до ужина — мораль читал: устав наизусть цитировал, инструкции, наставления...» [4, с. 26]. Старшына добра ведае не толькі статут, але і свайго ворага, Васкоў заўсёды трымае сваіх непрыяцеляў пад назіраннем. Як і Рыгор Карпенка, старшына Васкоў да сваіх салдат ставіцца са строгасцю і патрабавальнасцю, якая ўспрымаецца як неабходная якасць камандзіра на вайне.

У адносінах да начальства Васкоў выканаўчы, ветлівы, добра выконвае свае абавязкі, заўсёды пунктуальны. З боку начальства яго ведаюць як адказнага чалавека. Старшына паважліва ставіцца да кіраўнікоў: «...Всю свою жизнь Федот Евграфыч выполнял приказания. Выполнял буквально, быстро и с удовольствием, ведь именно в этом пунктуальном исполнении чужой воли видел смысл соб-

Рэпазіторый БарДУ

© Шчэрба Я. В., 2020

ственного существования. Как исполнителя его ценило начальство, а большего от него и не требовалось...» [4, с. 77—78].

Да Васкова ў атрад накіравалі дзяўчат-зенітчыц, якімі ён не ведаў, як камандаваць. Вялікая перашкода была ў тым, што старшына, які скончыў толькі чатыры класы, побач з дзяўчатамі адчуваў сябе непісьменным, хоць пісаць і чытаць ён умеў. У адносінах да дзяўчат Васкоў стрыманы, нешматслоўны, добры, уважлівы і адначасова патрабавальны. Строгім камандзір быў у адносінах толькі да тых падначаленых, якія не захоўваюць цішыню і канспірацыю, калі вораг побач. Нягледзячы на тое, што яго атрад складаўся з дзяўчат, ён паказваў сваю непахіснасць.

Як і Васкоў, Карпенка здаваўся падначаленым досыць сур'ёзным, спакойным і заўсёды ўпэўненым у сваіх дзеяннях. У некаторых яго ўчынках, аднак, можна ўбачыць эмацыйнасць і нават няўпэўненасць: «...Карпенка на самай справе быў не такі. Але за працяглы час камандзірства засвоіў сабе правіла: усё няпэўнае хаваць у сабе, а напаказ выстаўляць толькі скамянелую ўпэўненасць і непахісную цвёрдасць волі» [5, с. 27]. Непахіснасць як рыса камандзіра выразна праяўляецца ў Карпенкі. «Гэты цвердалобы Карпенка гатовы разбіцца ўшчэпкі, каб толькі выканаць які бязглузды загад» [5, с. 41], — злосна думае пра яго ў сваёй палахлівай разгубленасці Аўсееў. Карпенка, аднак, навучыўся ваяваць не толькі рашуча і мужна, але і разумна. Жыццё, асабліва мірнае, без праклятай вайны, ён цэніць, аднак памірае з думкай не пра сябе або цяжарную маладую жонку, якую кахаў «стрымана, па-свойму, без асаблівай ласкі, але моцна», а з клопатам пра тое, ці адбіта чарговая атака ворага [3, с. 52].

Старшына Васкоў, знешне строгі і патрабавальны ў душы, спачувае людзям. Ён стаў старэйшым братам для «сваіх» дзяўчат, дапамагае ім у вырашэнні канфліктаў і непаразуменняў. Старшына як родны чалавек апякуе сваіх падначаленых: то клапоціцца пра самаадчуванне Галі Чацвяртак, то змайструе чуні, то падыме на рукі, каб дзяўчына ногі ў халоднай вадзе не замачыла, то з мэтай выхавання возьме яе з сабой у разведку, то скажа добрае слова, то атуліць сваім шынелем.

Барыс Васільеў паказаў у вобразе Васкова, а Васіль Быкаў — у вобразе Карпенкі мужнасць, адвагу, рашучасць і ўпартасць. Васкоў, як і Карпенка, заўсёды «ідзе першы ў бой» і прытрымліваецца пазіцыі «ваяваць да канца»: «...Одно знал Васков в этом бою — не отступать. Не отдавать немцу ни кусочка на этом берегу. Как ни трудно, как ни безнадежно — держать. Держать эту позицию, а то сомнут — и все тогда...» [4, с. 173—174].

Для Васіля Быкава гераізм камандзіра — гэта не толькі рашучасць у баі, але перш за ўсё мужнасць духу. «Старшына, відаць, вельмі пакутаваў. Твар яго неяк раптоўна схуднеў, шчокі запалі, збялелі пад натапыраным шчаціннем, якое цяпер адразу пабольшала... Нічога ў ім ужо не было ад былой рупнай камандзірскай строгасці, толькі цьмяна ўгадвалася ў рысах твару нейкае запытанне, здзіўленне — можа, адбілася гэта ўчарашняя развага аб тым, каму з іх, шасцярых, суджана будзе закончыць бой» [5, с. 83], — стрымана, з рэалістычнай дакладнасцю піша Васіль Быкаў.

**Заключэнне.** Васіль Быкаў і Барыс Васільеў адчулі на сабе ўвесь цяжар вайны, таму стварылі яркія вобразы савецкіх камандзіраў — смелых, рашучых у барацьбе і ўнутрана глыбока сумленных. Камандзіры думаюць перш за ўсё пра людзей. Старшына Васкоў і старшына Карпенка — вобразы розныя, але іх звязвае ідэйнае і маральнае адзінства, сяброўства, пачуццё патрыятычнага абавязку, свядомая самаадданасць у барацьбе.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Вікіпедыя: свабодная энцыклапедыя [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/ . — Дата доступу: 15.10.2019.
2. *Шавалеева, В. Д.* Произведения Ахияра Хакимова о войне в контексте «лейтенантской прозы» : дис. … канд. филол. наук : 10.01.02. / В. Д. Шавалеева. — Уфа, 2012. — 188 л.
3. *Бугаёў, Д.* Васіль Быкаў : нарыс жыцця і творчасці : для сярэд. і ст. шк. узросту / Д. Бугаёў. — Мінск : Нар. асвета, 1987. — 207 с.
4. *Васильев, Б. Л.* А зори здесь тихие : повесть / Б. Л. Васильев. — М. : Совет. Россия, 1980. — 192 с.
5. *Быкаў, В.* Аповесці і апавяданні / В. Быкаў. — Мінск : Нар. асвета, 1978. — 208 с.


Репозиторий БарГУ